Г В. КАЖАМЯКІН

# ДЫЯЛЕКТЫКА ДУШЫ Ў ТВОРАХ МАКСІМА ГАРЭЦКАГА

Рассматривается философско-психологическая проблема диалектики души человека в произведениях М. Горецкого в рамках доктринального определения и в различных случаях проявления раздвоения человеческой души. Анализируется также понимание исследуемой доктрины М. Горецкого некоторыми учеными

This article deals with discusses the phylosophical and psychological problem of human sole's dialectics in Maxim Harecky's works in the frames of doctrin's defining and in different cases of humane sole's quality. The understanding of M. Harecky's doctrine is analysed here by scientists too.

Галоўнае месца ў філасофска-псіхалагічных асновах твораў М. Гарэцкага займае праблема дыялектыкі душы, што можна лічыць відавочнай аксіёмай: гэтая тэма ў пэўнай ступені праходзіць праз усю творчасць пісьменніка і адлюстроўваецца ў розных жанрах. Напрыклад, В. Максімовіч заўважае, што "ідэя дваістасці" з'яўляецца "адпачатнай і магістральнай у творчасці М. Гарэцкага" (Максімовіч 2000, 156).

Сапраўды, перш за ўсё праблему дыялектыкі душы ў яго філасофіі мы разумеем як разгляд стану двудушнасці асобы, а таксама як дактрыну пра існаванне ў **кожнага** чалавека ад прыроды ўнутрыдушэўнай дваістасці. У артыкуле "Развагі і думкі" (1914) пісьменнік-філосаф найбольш выразна выклаў сваю дактрыну, што дае патрэбнае тлумачэнне стрыжнявой тэме яго творчасці. Аўтар вызначае два тыпы двудушнасці: "...калі чалавеку ўжо не стае сіл разумнай волі, штоб не здвудушнічаць, альбо двудушным ён бывае, узіраючы на вымогі вума"; "...калі чалавек сумысля і ў угоду свайму злому боку не слухаецца голасу дабра і забівае ў сабе добрае карэнне..." (Гарэцкі 1990, 181). Тут першае падаецца як **міжвольная двудушнасць**, а другое, адпаведна, як **адвольная.**

М. Гарэцкі дае шырокае тлумачэнне паняцця "двудушнасць". Гэта звязана з паглыбленым псіхааналітычным даследаваннем чалавечай душы. У такім выпадку аўтар з'яўляецца яшчэ і псіхолагам, сацыёлагам, антраполагам. Але даследчыкі не заўсёды бяруць да ўвагі шырокае разуменне пісьменнікам такога феномена душы пры крытычным аналізе яго творчасці, напрыклад аповесці "Дзве душы" (1918–1919). Гэтак І. Чыгрын гаворыць, што ў гэтым творы "выразна акрэслена праблема дзвюх душ (сялянская і панская ў адной асобе)..." (Чыгрын 1994, 129).

Несумненна, М. Гарэцкі разглядвае праблему раздвоенасці душы на сялянскую і панскую. Такая сацыяльная двудушнасць, як і нацыянальная – калі вагаецца нацыянальная самасвядомасць, – прысутнічае ў філасофіі аповесці "Дзве душы". Пісьменнік як псіхолаг аналізуе розныя выпадкі, ступені праяўлення двудушнасці, разглядвае, як можа выявіцца такая душэўная асаблівасць чалавека і ў час рэвалюцыйных катаклізмаў, калі адбываюцца вялікія хваляванні, калі вырашаюцца нацыянальныя і сацыяльныя пытанні лёсу Беларусі. Але разам з тым праблему "дзвюх душ" у аповесці "Дзве душы" нельга разумець у межах толькі нацыянальнага і сацыяльнага, бо, як заўважана вышэй, сам М. Гарэцкі ў сваёй дактрыне даў шырокае тлумачэнне такой з'яве. Заўважым, што ён спрачаецца ў артыкуле з тымі, хто сцвярджае пра двудушнасць беларуса: "Ці не чулі вы, што:

– Беларусы двудушны?..

А?

Ведама, гэта няпраўда, паклёп, напасць!" (Гарэцкі 1990, 181).

Пісьменнік даказвае: "Двудушнасць ад прыроды ў чалавеку" (Гарэцкі 1990, 181).

У гэтым выпадку падобнае сцвярджэнне можа мець два розныя значэнні: калі чалавек двудушны, дык ад прыроды; кожны чалавек двудушны. Узнікае пытанне: што ж мае на ўвазе аўтар? Трэба заўважыць, што М. Гарэцкі

аспрэчвае думку пра двудушнасць беларусаў. Значыць, тут маецца на ўвазе другое з названых значэнне, бо першае – гэтага не аспрэчвае.

В. Максімовіч адзначае: "Нельга чалавеку быць аднамерным і мець адну душу" (Максімовіч 2000, 156). Гэтая думка падмацоўвае шырокае тлумачэнне дактрыны М. Гарэцкага. Але разам з тым вучоны даследуе праблему двудушнасці ў кантэксце дваістага ўнутранага стану беларуса. У гэтым выпадку патрабуецца ўдакладненне: нацыянальны фактар, як намі ўжо заўважана, да прыроды такога раздваення дачынення не мае. Наадварот – двудушнасць можа стаць прычынай раздвоенасці нацыянальнай самасвядомасці. Памыляецца А. Марціновіч, які піша: «"Дзве душы" М. Гарэцкага створаны з думкай аб тым, каб душа чалавечая ніколі не дваілася» (Марціновіч 1994, 49). І гэта, як бачым, не суладнае з дактрынай М. Гарэцкага, бо прыроджанае – назаўсёды.

У сваім поглядзе стасоўна дваістасці душы як прыроднай рысы чалавека ён быў далёка не адзін і далёка не першы, хто сцвярджаў падобнае. Варта згадаць ліставанне расійскага пісьменніка Ф. Дастаеўскага з К. Юнге, якая так адзначала ў лісце: "...у мяне дваістасць у характары, даведзеная да апошняй ступені. Дваістасць гэтая вымушае мяне заўжды рабіць тое, што я цалкам усведамляю, чаго не павінна была б рабіць <...> ... толькі рука спрактыкаванага псіхолага можа вывесці мяне на свет божы" (Цыт. па: Достоевский 1988, 331).

Ф. Дастаеўскі адказвае К. Юнге: "Што Вы пішаце пра Вашу дваістасць? Але гэта самая звычайная рыса ў людзей... не зусім, усё-такі, звычайных. Рыса ўласцівая людской прыродзе наогул, ды якая далёка не ва ўсякай прыродзе чалавечай сустракаецца ў такой сіле, як у Вас" (Достоевский 1988, 149). Ён падкрэслівае, што сам мае такую ж раздвоенасць; яна для яго вялікая пакута і ў той жа час вялікая асалода.

Як бачна, Ф. Дастаеўскі і М. Гарэцкі блізкія адзін да аднаго ў тлумачэнні двудушнасці як прыроднай рысы чалавека, хаця ў кожнага з іх – сваё арыгінальнае вызначэнне і ўспрыманне дваістасці душы.

Англійскі філосаф XX ст. А. Тойнбі сцвярджае: "Раскол у людской душы – гэта эпіцэнтр расколу, які праяўляецца ў грамадскім жыцці..." (Тойнби 1991, 358). На прыкладзе мастацкіх твораў М. Гарэцкага мы маем падмацаванне такой думкі. Можна сказаць, што і беларускі класік нібы падае падобны тэзіс пра сувязь паміж асабістым раздваеннем і грамадскім. У ранняй творчасці (зб. "Рунь", 1914) як філасафема паўстае бачанне разлому паміж двума ментальна процілеглымі соцыумамі. Цяжка ўявіць сабе лучнасць такіх палярнасцяў. Проціластаўленне *інтэлігенцыя – народ* – тлумачэнне таго моманту двудушнасці, калі чалавек (выхадзец з нізоў), апынуўшыся сярод інтэлігентаў, стаўшы адным з іх праз уласныя намаганні, адукацыю, раптам задумваецца пра сваё "роднае карэнне", якое па сваім духу цяпер ужо стала не зусім родным для яго. Такая ўнутрыдушэўная драма адбываецца і з Ігнатам Абдзіраловічам ("Дзве душы"). Падобнае адчуў на сабе і выхадзец з вёскі М. Гарэцкі. Праблема абсурднага проціластаўлення *інтэлігенцыя – народ* перашкаджала ідэі кансалідацыі беларускай нацыі. Для нацыянал-камуніста М. Гарэцкага была важнай менавіта такая задача. Англійскі сацыёлаг, філосаф Э. Сміт з гэтай нагоды адзначае, што нацыянал-камуністы "прапанавалі універсальныя лекі супраць сацыяльных хваробаў – стварэнне моцнай цэнтралізаванай дзяржавы, заснаванай на нацыянальным падмурку...", а таксама сцвярджае "папулісцкі нацыяналізм, які можа аб'яднаць інтэлігенцыю з сялянствам", што прынялі камуністы, адышоўшы ад класічнага марксізму (Сміт 1995, 145).

Зразумела, што такое вызначэнне мае стасунак і да філасофіі М. Гарэцкага. Але трэба разумець, што ён спрабаваў выкарыстаць гістарычна ўзніклую рэвалюцыйную сітуацыю, шукаючы тут ідэю роўнасці класаў насуперак

ідэі класавай варожасці, што ў той час не было папулізмам: раскол грамадства, як мы ўжо заўважылі, мае сувязь і з раздваеннем душы.

У вучэнні пра двудушнасць чалавек выглядае як асоба ірацыянальная, няўстойлівая ў сваіх поглядах і думках. Гэта апраўдвае шматлікія людскія грахі, хістанні свядомасці – тое, што часам прыводзіць да злачыннасці. Дастаткова прыгадаць душэўную драму Раскольнікава (Ф. Дастаеўскі "Злачыннасць і пакаранне") або Антона (М. Гарэцкі "Антон"). Злачыннасць гэтых персанажаў – вынік складанага працэсу дыялектыкі душы. Такая канцэпцыя душэўнага ладу была непрымальная для бальшавіцкай ідэалогіі. Герой М. Гарэцкага, які мае "дзве душы", процістаіць ідэалу пралеткультаўскай літаратуры.

Абдзіраловіч у аповесці "Дзве душы" перажывае ледзь не раздваенне асобы, што лічыцца ненармальнасцю, але аўтар паказвае звычайную жыццёвую акалічнасць, калі выяўляецца нармальная людская двудушнасць, даказваючы раней вызначанае ім, цяпер – у мастацкай літаратуры: «Душа дваілася. Адна палова несказана плакала і жалілася на другую, нашто яна мучыць яе падманкамі. І калі ён троху выстагнаўся, казала: "Уцячы, уцячы..."» (Гарэцкі 1990, 24). Гаворка ў гэтым выпадку – пра каханне Абдзіраловіча, а значыць, М. Гарэцкі паказвае праблему двудушнасці ў аповесці праз выяўленне такога людскога пачуцця, перажывання. Што тычыцца тыпу двудушнасці, дык ён, паводле дактрыны М. Гарэцкага, у апошнім прыкладзе – першы, бо гэта адбываецца як міжвольны псіхалагічны працэс дваення. Але тут больш складаны выпадак двудушнасці – патрэбнае дапаўненне да аўтарскага вучэння. Разам з тым у аповесці выяўляецца нібы эвалюцыя раздвоенасці душы, што апісваецца такім чынам: "І душа дваіцца. Дзве душы. Тая, што плакала і жалілася на другую, нашто яна мучыць яе падманкамі, цяпер цвярдзее, але робіцца нядобраю, набірае ўсё болей нейкай калянасці і нават жорсткасці. Няхай сабе тая плача па нейкай паненцы. Ёй не шкода, і яна не здрыгнецца, калі дзікая людская куламеса пашарпае на шматкі і князя, і Макасея-міліёншчыка, і разумца-армяніна.

Ёй не шкода... А тая, другая, падумала і здрыганулася" (Гарэцкі 1990, 26).

У гэтым фрагменце назіраецца рух у кірунку да другога тыпу двудушнасці, процістаянне дабра і зла. Набірае сіл другі бок, ва ўгоду якому герой аповесці не слухаецца голасу дабра (выраз у дактрыне). Але змаганне ў душы Абдзіраловіча працягваецца, бо другая, добрая душа "падумала і здрыганулася". Без такога змагання мы не гаварылі б, што гэта тып двудушнасці.

Раздвоенасць душы звязана яшчэ і з праявай звычайнай чалавечай **амбівалентнасці.** Такі тэрмін увёў у 1930 г. швейцарскі псіхіятр Э. Блейлер для вызначэння супярэчлівага псіхічнага стану (гл.: Беларуская энцыклапедыя 1996, 308). Утрыраваная амбівалентнасць прыводзіць да шызафрэніі.

Увогуле, паняцце "дзве душы" для аповесці існуе ў некалькіх, як мы заўважылі, значэннях: прыродная двудушнасць, характэрная ўсім; двудушнасць, звязаная з раздвоенасцю нацыянальнай самасвядомасці; выпадкова акалічнасная дваістасць душы, адлюстраваная ў аповесці на прыкладзе таго, як памянялі маленькіх хлопчыкаў, кожны з якіх выхоўваўся ў чужой сям'і. У апошнім выпадку атрымалася ўнутрыдушэўнае проціпастаўленне *Ігнат – Васіль* або, як было заўважана, *інтэлігент – селянін.*

Праблема дыялектыкі душы паўстае таксама і ў кнізе "На імперыялістычнай вайне" (1926), напрыклад, чытаем: "Ці гэта дзве душы ўва мне – усходняя і заходняя?" (Гарэцкі 1995, 367). У апавяданні "Смачны заяц" аўтар нават выносіць у эпіграф далейшы фрагмент як тлумачэнне ўласнай дактрыны: "Спачуццё шчаслівага да няшчаснага сфальшывіла чыстую ў муках душу чалавека" (Гарэцкі 1984, 263). Праблема дыялектыкі душы ў гэтым апавяданні падаецца праз выяўленне душэўнай пакуты героя твора. Як бачна, аўтар нават сцвярджае пра душэўную чысціню пакутніка, што

сфальшывіла раптоўнае шчасце – пазбаўленне страху быць пакараным за ўчыненае, але цяпер гэтая пагроза існуе для іншага. Такая праблема паўстае таксама і ў апошнім, трэцім светапоглядным перыядзе творчасці М. Гарэцкага, напрыклад у творы "Лявоніус Задумекус" (1931–1932), дзе прысутнічаюць падобныя звароты пісьменніка да сябе: "Лячы ж яго, лячы, Лявоніус Задумекус! Табе даецца магчымасць, – лаві ж яе за хвост, блазенны імпатэнце, бо, можа, яна апошняя ў цябе..." (Гарэцкі 1993, 55). У прыведзеным фрагменце яднаюцца трагічная самаіронія пісьменніка-філосафа і погляд на сябе збоку.

Такім чынам, праблема дыялектыкі душы ў творчасці М. Гарэцкага выяўляецца на розных узроўнях, у розным кантэксце, у розных абставінах у шматлікіх творах. Дактрына, сфармуляваная пісьменнікам, па сутнасці, гуманістычная. Доследы дыялектыкі душы асобы ён праводзіў на працягу доўгага часу праз мастацкія творы. Фактычна пачатак сацыялагічнай думкі ў беларускай літаратуры – гэта даследаванне праблемы двудушнасці ў творах беларускага пісьменніка. Такая праца М. Гарэцкага мусіць усведамляцца ў рамках псіхааналізу ў літаратуры. Сам М. Гарэцкі – пачынальнік гэтай плыні ў айчынным пісьменстве, а сфармуляваная ім дактрына пасвойму унікальная.

ЛІТАРАТУРА


Беларуская энцыклапедыя. У 18 т. Мн., 1996. Т. 1.

Гарэцкі М. Зб. тв.: У 4 т. Мн., 1984. Т. 1

Гарэцкі М. Лявоніус Задумекус // Полымя. 1993. № 2.

Гарэцкі М. Творы. Мн., 1990.

Гарэцкі М. Творы. Мн., 1995.

Достоевский Ф. Полн. собр. соч.: В 30 т. Л., 1988. Т. 30. Кн. 1.

Максімовіч В. Эстэтычныя пошукі ў беларускай літаратуры пачатку ХХ ст. Мн., 2000.

Марціновіч А. Шляхам праўды: Выбраныя старонкі беларускай літаратуры ў святле сённяшняга дня. Мн., 1994.

Сміт Э. Нацыяналізм у дваццатым стагоддзі. Мн., 1995.

Тойнби А. Постижение истории. М., 1991.

Чыгрын І. Паміж былым і будучым: Проза М. Гарэцкага. Мн., 1994.


Паступіў у рэдакцыю 07.01.2003.

*Генадзь Вячаслававіч Кажамякін* – бібліятэкар БДПУ імя М. Танка.

*О.Л. КОРЕНЬКОВА*

# ПОЭТИКА ЛИРИЧЕСКОГО ЦИКЛА ГЕОРГИЯ ИВАНОВА "ОТПЛЫТИЕ НА ОСТРОВ ЦИТЕРУ"


Исследуется лирический цикл как жанровое образование, целостное восприятие которого позволяет проследить формирование мировоззренческой позиции Георгия Иванова. Анализ ивановского произведения "Отплытие на остров Цитеру", осуществляющийся от заглавия к семантике стихотворений, его составляющих, выявляет специфические авторские особенности данного жанра.

Research subject is a lyrical cycle as a genre unit, its comprehensive realizing allows following the formation of the authors outlook concept. Unity analysis of Ivanov's work "Sailing off to the Island of Cythera" carried out from the headline to the semantics of verses which are forming it, reveals specific author's peculiarities of the genre.


Лирический цикл как особое "жанровое образование" (Фоменко 1992, 3), окончательно сформировавшееся в начале XX в. под влиянием идей В. Брюсова и А. Блока, получил широкое распространение среди поэтов того времени, а позднее стал предметом активного интереса литературоведов. Постепенное "исчезновение" традиционных лирических жанров, модернистская концепция взглядов на мир и искусство привели к тому, что во внимание стало приниматься *не одно стихотворение*, а их *совокупность, ансамбль* – цикл или же в широком значении книга стихов. Символисты поставили своей задачей воплощение в художественной ткани текстов не